УДК 378:355.233

В. У. Коваль, канд. гіст. навук

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПАЭТЫЧНЫМІ СРОДКАМІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ СПЕЦЫЯЛЬНАГА КУРСА «ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА САВЕЦКАГА НАРОДА Ў КАНТЭКСЦЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ»

This article is about the patriotic education in the special course of the history of Second World War. The materials of Belarusian literature can be used at the teaching of military history.

У апошнія гады ў сусветнай гістарычнай навуцы з'яўляюцца і актыўна распрацоўваюцца новыя кірункі метадалогіі гісторыі. Інтэграцыя навук сёння стала неабходнай. Менавіта пры ўжыванні актыўнага міжнавуковага дыялога можна больш грунтоўна і ўсебакова прадставіць гістарычныя перыяды, падзеі і з'явы. Пры выкладанні спецкурса «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны» існуюць шырокія магчымасці выкарыстання мадэлі міждысцыплінарнага даследавання.

Вядомы даследчык метадалогіі гісторыі прафесар У. Н. Сідарцоў у сваім дапаможніку «Метадалогія гісторыі: колькасныя метады і інфармацыйныя тэхналогіі» [1] адводзіць важную ролю актыўнаму міжнавуковаму дыялогу, адзначае, што на макраўзроўні міждысцыплінарнасць ужо стала рэальнасцю, пачалі з'яўляцца новыя напрамкі ў сусветнай гістарычнай навуцы. Аднак на сённяшні дзень у магчымай мадэлі міждысцыплінарнага даследавання ёсць шэраг нявывучаных пытанняў, якія могуць выклікаць дыскусіі. Спрэчнай стала распрацоўка навуковай мовы даследавання, інтэрпрэтацыя вынікаў, метадычная схема аналіза, незразумелымі застаюцца межы запазычанняў з «чужой» навукі.

Нягледзячы на вялікую колькасць даследаванняў па гісторыі Другой сусветнай вайны, многае яшчэ застаецца нявывучаным і недастаткова распрацаваным. Пра вайну пішуць па-рознаму. Часта пры апісанні ваенных падзеяў уплывала ўстаноўка савецкіх прапагандыстаў, каб паказваць выключна гераічныя моманты. Пры выкладанні дадзенага спецкурса можна выкарыстоўваць не толькі гістарычныя матэрыялы, але і падручнікі па беларускай літаратуры.

Паэтычныя сродкі пры гістарычным аналізе дазволяць раскрыць не толькі асноўныя падзеі ваеннага часу, але і дапамогуць студэнтам задумацца над псіхалагічнымі праблемамі вайны. Прыклады твораў беларускіх паэтаў і пісьменнікаў дазволяць яскрава патлумачыць ваенны час, паўсядзённасць на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Менавіта вершы аўтараў, якія самі сталі сведкамі крывавых бітваў, акупацыйнага рэжыму і Дня Перамогі, дапамагаюць сучасным пакаленням уявіць суровыя рэчаіснасці вайны.

Спецкурс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны» мае на мэце асвятліць не толькі ход баявых дзеянняў, але і паказаць існаванне псіхалагічнай вайны паміж Германіяй і Савецкім Саюзам. Нямецкая ўлада адводзіла важную ролю сістэме прапаганды, якая актыўна дзейнічала на захопленых тэрыторыях. Прапаганда для нямецкага боку была адным з асноўных момантаў у распаўсюджванні нацысцкіх ідэй, менавіта сродкі масавай інфармацыі маглі заклікаць да супрацоўніцтва з немцамі, пераконваць беларусаў у неабходных рэйху меркаваннях. Мэтай спецкурса павінна стаць дакладнае тлумачэнне перамогі савецкай патрыятычнай прапаганды над агітацыяй акупантаў. Матэрыялы савецкіх ваенных лістовак, газет і часопісаў адыгралі важнае значэнне ў Вялікай Айчыннай вайне.

Па ўспамінах былых партызан, у партызанскія атрады з «Вялікай зямлі» разам са зброяй, медыкаментамі дасылалі паэтычныя зборнікі, лістоўкі з вершамі вядомых савецкіх паэтаў. Неабходна адзначыць ролю творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, І. Мележа, П. Панчанкі, М. Танка, В. Бергольц, К. Сіманава, А. Твардоўскага, Ю. Друнінай пры арганізацыі ўсяго савецкага народа на барацьбу з ворагам. Вялікую творчую актыўнасць праяўлялі самадзейныя партызанскія паэты. У партызанскім друку выступалі Г. Дзідзенка, Ф. Заленка, Е. Казлоўская, Я. Крайнік, В. Міланаў, В. Саблін і інш.

Партызанская ініцыятыва ў арганізацыі культурна-асветніцкай працы была досыць разнастайная. У партызанскіх атрадах ладзіліся літаратурныя вечарыны, выпісваліся ілюстраваныя рукапісныя часопісы і насценныя газеты, ствараліся агітацыйныя калектывы. Згодна з даследаваннямі, у партызанскіх атрадах выпускаліся каля 237 часопісаў, больш за 160 насценных газет і мноства баявых лістовак [2]. Пад патрыятычнымі лозунгамі праходзілі палітыка-масавыя мерапрыемствы, сходы, мітынгі, святкаванні памятных датаў.

Паэзія адлюстроўвала настроі і перажыванні грамадства, смутак у сувязі з гібеллю родных і блізкіх, веру ў будучую перамогу. Выкарыстанне вершаў і паэм удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны стварае дадатковую матывацыю вывучэння дадзенага спецкурса. Зацікаўленасць паэзіяй асобнага аўтара можа дапамагчы студэнту зразумець гістарычную рэчаіснасць ваеннага часу. У сувязі з гэтым неабходна ўспомніць

творчасць А. Астапенкі, А. Бялевіча, А. Вольскага, М. Машары, Я. Непачаловіча, А. Пысіна, М. Скрыпкі, М. Смагаровіча, М. Лужаніна, М. Васілька, А. Астрэйкі і інш.

Формай правядзення міждысцыплінарных заняткаў можа стаць студэнцкая канферэнцыя. Даклады па гісторыі вайны і беларускай літаратуры могуць быць аб'яднаныя агульнай тэматыкай. Тэмы гераізму чырвонаармейцаў, партызанаў, падпольшчыкаў могуць разглядацца ў гістарычным аспекце, а літаратурная творчасць у час вайны дапоўніць характарыстыку асноўных падзей.

Неабходна выкарыстоўваць методыку выхавання патрыятызму пры вывучэнні біяграфій герояў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, работнікаў культуры. Для вывучэння біяграфіі творцы могуць выкарыстоўвацца розныя жанры, такія як мемуары, дзённікі, эпісталярый і інш. Трэба падкрэсліць важнасць выкарыстання прыватных гістарычных крыніц пры выкладанні дадзенага спецкурса і выхаванні пачуцця гонару за свой народ.

Прыкладам можа стаць біяграфія Васіля Быкава. Пры вывучэнні жыцця пісьменніка неабходна адзначыць, што з першых дзён вайны ён быў на перадавой, малодшым лейтэнантам ваяваў у пяхоце і артылерыі, двойчы быў цяжка паранены, значыўся ў ліку загінуўшых і пахаваных у брацкай магіле пад Кіраваградам. У літаратуразнаўстве творы Васіля Быкава называюць «лейтэнанцкай», «франтавой», «акопнай» прозай [3].

Аналіз асноўных падзей вайны дазваляе паказаць высокі духоўны ўздым у тагачасным грамадстве, які праявіўся ў гераізме салдат, партызанаў, падпольшчыкаў, жыхароў акупіраванай Беларусі. Патрыятызм асноўнай масы насельніцтва знайшоў сваё адлюстраванне ў розных відах мастацкай творчасці. Сінтэз гісторыі Беларусі і літаратуры дазваляе пашырыць агульны кругагляд студэнтаў, выклікаць станоўчыя эмоцыі, адчуванне патрыятызму і гонару за свой народ. Індывідуальна-асабовае ўспрыняцце студэнтамі твораў беларускай літаратуры дазволіць больш глыбока зразумець гістарычны перыяд.

Важнае значэнне павінна аддавацца вывучэнню культурна-асветніцкай дзейнасці, якая з'яўляецца часткай палітычна-ідэалагічнай працы. Неабходна падкрэсліць, што ў ажыццяўленні патрыятычнай прапаганды ў ваенны час важная роля належыла інтэлегенцыі, асабліва беларускім паэтам і пісьменнікам.

Такім чынам, бязмежная асацыятыўная ёмкасць паэзіі выдатна дастасоўваецца да выкладання гісторыі Другой сусветнай вайны ў межах дадзенага спецкурса. Усебаковае адлюстраванне подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з улікам матэрыялаў публіцыстыкі, паэзіі і прозы садзейнічае ўмацаванню памяці аб народным подзвігу, яго ўспрыманню не толькі розумам, але і сэрцам.

**Літаратура**

1. Сидорцов, В. Н. Методология истории: количественные методы и информационные технологии / В. Н. Сидорцов. – Минск: БГУ, 2003. – 143 с.

2. Бяспалая, М. А. Праблемы Вялікай Айчыннай вайны ў вучэбна-выхаваўчым працэсе вышэйшых навучальных установ культуры і мастацтва / М. А. Бяспалая // Беларусь в годы Великой Отечественной войны: уроки истории и современность: материалы Междунар. науч. конф. / Ин-т истории НАН Беларуси, сост. А. М. Литвин [и др.]. – Минск, 2004. – С. 228.

3. Давыдава, Г. М. Выхаванне патрыятызму ў школьнікаў і студэнтаў пры вывучэнні біяграфій і творчасці беларускіх пісьменнікаў аб Вялікай Айчыннай вайне / Г. М. Давыдава // Великая Победа: героизм и подвиг народов: материалы Междунар. науч. конф. Т. 2. / Ин-т истории НАН Беларуси, отв. ред. А. М. Литвин. – Минск, 2006. – С. 184.